

СЮЖЭТЫ ПА-ЗА ЧАСАМ 5

ПАЛІВАЦЬ НЕ ТРЭБА: ЧАКАЮЦЦА ДАЖДЖЫ 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

21 ЛІПЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 139 (30019)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі:**

*«Мы павінны зрабіць усё для таго, каб людзі ў нашай краіне ўсюды адчувалі клопат пра сябе. Гэта самае галоўнае ў рабоце са зваротамі грамадзян. Іншага не дадзена. Мы вялікую работу праводзім у краіне для таго, каб зрабіць жыццё нашых людзей лепшым. Таму што гэта асноўнае патрабаванне нашага Прэзідэнта. Ён заўсёды кажа: галоўнае для нас — народ. Вядома, фармалізму ў такой рабоце нельга дапускаць. Яна праводзіцца не толькі для таго, каб вырашыць канкрэтныя пытанні канкрэтнага чалавека, а яшчэ і для таго, каб мы вылучылі праблемы, найбольш характэрныя для таго ці іншага рэгіёна нашай краіны. Мяне вельмі парадавала, што людзі прыходзяць не са сваімі асабістымі пытаннямі, а з пытаннямі, якія датычацца ўсёй краіны. Гэта дарагога варта. Гэта значыць людзі давяраюць уладзе, ідуць са сваімі прапановамі, пажаданнямі. І з людзьмі мы павінны працаваць вельмі адказна».*

## КОРАТКА

- **Беларускі педатрад выехаў на работу ў Татарстан.**
- Паслугамі БЧ скарысталася больш як 7 тысяч гасцей «Славянскага базару».
- **БРСМ і Усерасійскі студэнцкі корпус ратавальнікаў падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.**

# КАПІТАН ХЛЕБНАГА ПРАСТОРУ



Фота БелТА.

Камбайнер сельгаспрадпрыемства «Бародзічы» Зэльвенскага раёна Уладзімір АРХІП першы на Гродзеншчыне намалаціў звыш тысячы тон збожжа новага ўраджаю. «Да выніку не імкнуўся, хоць чалавек азартны, — прызнаўся механізатар. — Не першы раз займаю месцы і па гаспадарцы, і па раёне. Проста камбайн не падводзіў, плошчы былі, надвор'е, адвозка таксама і ўраджайнасць. Нядрэнны азімы ячмень у нас сёлета, і рапс таксама нядрэнны». Навіну аб тым, што ён першы ў вобласці пераадолеў тысячны рубеж, Уладзімір Архіп даведаўся, зразумела, на рабоце. Важнасць уборачнай разумеюць і ў сям'і. На жніве мужчыну падтрымліваюць самыя блізкія — жонка, дачка, сын. Аб сакрэце поспеху Уладзімір Архіп кажа стрымана і проста: «Важна працаваць, своечасова абслужыць тэхніку і глядзець за ёй, а ўсё астатняе прыйдзе».

Прыёмная кампанія

## Фларысты, рэстаўратары, спецыялісты па інфармацыйнай бяспецы

### Каледжы прапануюць абітурыентам новыя магчымасці для прафесійнага выбару

**20 ліпеня ў краіне распачаўся прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія паступаюць на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Прыёмная кампанія ў ССНУ будзе доўжыцца месяц.**



Трэба мець на ўвазе, што паводле новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі ўсе навучальныя ўстановы, якія рэалізоўваюць праграмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, перайшлі на адзіны від установы адукацыі — цяпер гэта каледж. Сёння ў краіне іх налічваецца 229. Акрамя таго, быў уведзены новы класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Гэта важны дакумент, у якім перагледжаны найменні спецыяльнасцяў, унесены новыя, а нейкія страцілі сваю актуальнасць і былі выключаны.

СТАР. 3

Разумныя грошы

## ДЭПАЗІТЫ НА РОЗНЫ ГУСТ

### Уклады ў рублях больш выгадныя



**Кожны мае разумець — грошы не павінны ляжаць без справы. Калі ў вас ёсць нейкія зберажэнні — іх трэба прымусіць прыносіць прыбытак. Найбольш простым і ў той жа час вельмі эфектыўным інструментам з'яўляюцца банкаўскія ўклады або, як іх яшчэ называюць, дэпазіты. Што трэба ведаць пра ўклады перад тым, як прыступіць да выбару прадукту? Уклады ў беларускіх рублях адрозніваюцца высокімі стаўкамі — яны робяцца такімі для таго, каб абараніць вашы зберажэнні ад інфляцыі. Уклады ў замежнай валюце не прынясуць вялікага даходу, але пацешаць стабільнасцю. Такім чынам, працэнтныя стаўкі па ўкладах у рублях могуць прынесці добры прыбытак, калі падысці да справы з розумам. А дэпазіты ў валюце засцерагаюць ад дэвальвацыі, праўда — не заўсёды.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23139

9 771990 763008

Жніва-2023

# Намалочана каля 610 тысяч тон збожжа новага ўраджаю

**Як паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, паводле даных на 20 ліпеня, збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі, проса) убраны на 175,2 тысячы гектараў, або 8,85 працэнта ад плана. Намалочана 610 тысяч тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 34 цэнтнеры з гектара.**

Азімы ячмень убраны на 143,4 тысячы гектараў (93,6 працэнта ўборачнай плошчы), намалочана 500 тысяч тон пры сярэдняй ураджайнасці 34,9 ц/га. Азімага рапсу на збожжы ўбрана 79,1 тысячы гектараў (23,8 працэнта ўборачнай плошчы), намалочана 171,2 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці 21,7 ц/га.

Лён выцераблены на 8,35 тысячы гектараў, што складае 19,1 працэнта ўборачнай плошчы. Нарыхтавана 353,4 тысячы тон сена — 36,7 працэнта да плана, каля 8 мільёнаў тон сенажу — 58,1 працэнта (у тым ліку ў палімерную ўпакоўку 258,5 тысячы тон), 351,4 тысячы тон збожжасенажу і 197,1 тысячы тон сіласу.

Усяго сёлета плануецца атрымаць з траў 9,6 мільёна тон кармавых адзінак. Да гэтага часу нарыхтавана 26,6 працэнта ад плана.

# ГОСЦІ НА ПАРОГ — КАРАВАЙ НА СТОЛ

**Хлебапякарная вытворчасць — адна з вядучых галін харчовай прамысловасці Беларусі, якая пастаянна развіваецца. Хлеб і хлебабулачныя вырабы з'яўляюцца прадуктамі штодзённага попыту, адыгрываюць важную ролю ў забеспячэнні харчовай незалежнасці і бяспекі краіны. Такую думку выказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення перапрацоўчай прамысловасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Ірына БАРАНЦЭВІЧ.**



Па яе словах, у хлебапякарнай галіне 65 % займаюць прадпрыемствы сістэмы Мінсельгасхарча, каля 20 % — «Мінскхлебпрама», каля 15 % — «Белкаапсаюза». У спажывецкай кааперацыі дзейнічае 55 хлебапякарных прадпрыемстваў, размешчаных у райцэнтрах і сельскай мясцовасці, шэсць арганізацый «Мінскхлебпрама» знаходзіцца ў сталіцы. У галіне занята каля 1 тысячы чалавек.

Унутраны рынак сёння цалкам забяспечаны айчыннай хлебабулачнай прадукцыяй. Асартымент налічвае звыш дзвюх тысяч найменняў, і ён не змяншаецца. Хлебапёкі штогод распрацоўваюць новыя віды прадукцыі, актыўна працуюць з дзяржаўным прадпрыемствам «Белтэхнахлеб». Карыстаюцца попытам дыетычныя, спецыялізаваныя вырабы для розных груп і ўзростаў насельніцтва: цяжарных жанчын, спартсменаў, пажылых людзей. Распрацаваны такія перспектыўныя кірункі, як замарожаныя вырабы, кансерваваныя спіртам, падвергнутыя цеплавой стэрылізацыі. На заводах укараняюцца новыя сучасныя тэхналогіі, якія дазваляюць павялічыць тэрмін захоўвання заварнога хлеба з 96 сутак да трох месяцаў і пры гэтым выключыць прымяненне хімічных кансервантаў і дабавак.

— Гэта экспартны патэнцыял, хлебабулачныя вырабы можна прапаноўваць у іншыя краіны, — лічыць Ірына Баранцэвіч.

Як адзначыла Ірына Алегаўна, цяпер усе хлебапякарныя камбінаты высокамеханізаваныя. Тут заменены тэхналагічнае абсталяванне, упаковачныя лініі на сучасныя аўтаматычныя, паўаўтаматычныя. Штогод працягваецца мадэрнізацыя. Эстэтыка вытворчасці на заводах на высокім узроўні. Гэта дазваляе выпрабляць прадукцыю высокай якасці. З задавальненнем спажываюць беларускія хлебабулачныя вырабы за мяжой — экспарт з кожным годам павялічваецца.

— «Белкаапсаюз» з'яўляецца адным з найбуйнейшых вытворцаў хлебабулачнай прадукцыі ў Беларусі. Заводы сістэмы спажыўкааперацыі займаюць больш за 15 працэнтаў айчыннага каравая, — паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення прамысловасці, якасці і стандартызацыі Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Таццяна КАСЯКОВА**. — Дзякуючы прафесіяналізму работнікаў хлебазаводы і пякарні «Белкаапсаюза» выпускаюць шырокі асартымент прадукцыі, які пастаянна пашыраецца і абнаўляецца. Без гэтага нельга ўтрымаць пастаянных пакупнікоў і прыцягнуць новых.

Вырабляецца хлебабулачная, кандытарская, снэкавая прадукцыя з функцыянальнымі дабаўкамі — збожжавымі сумесямі, вотруб'ем, кукурузнай або грачанай мукой, сухафруктамі.

— Многія віды хлебабулачных вырабаў спажыўкааперацыі сталі брэндам. Напрыклад, хлеб фармавы, які пакупнікі называюць «цаглінка». Наладжана вытворчасць хлеба подавага і заварнога, жытнёва-пшанічнага. Шырокі выбар булачных вырабаў: батоны, багеты, хлеб тоставы, плецяныя і вітыя булачныя, здобныя дробнаштучныя вырабы з рознымі начынкамі, пірагі, караваі, сарты хлеба з чарнаслівам, разынкамі, арэхамі, сухафруктамі, а таксама хлеб з салам і часнаком, — канстатавала Таццяна Іванаўна.

Прыйшліся даспадобы спажыўцам хлябы подавыя заварныя «Нарач», «Браслаўскі», «Чэрвеньскі», «Чабарок», «Вясёлкавы» з сухафруктамі, «Мядовы» з соладам, а таксама булачныя вырабы: батон «Каласковы», пляцёнка «Сонечная», пірагі «Асалода», казінакі «Фларэнта», мучныя прысмакі «Госці на парог», «Грыбы па-хойніцку».

Хлебабулачную прадукцыю «Белкаапсаюза» можна адрозніць на паліцах магазінаў па маркіроўцы «Каласок», «Ежа без шкоды». Хлеб ды розныя прысмакі можна таксама набыць у крамах каля хлебапякарных заводаў «Гарачы хлеб». Іх у сістэме налічваецца 40.

«Белкаапсаюз» дастаўляе прадукцыю нават у крамы самых аддаленых вёсак асабістым транспартам — 556 машынамі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**




# Прагназуюць рост аб'ёмаў вытворчасці і прыбыткі

**Кіраўнікі прадпрыемстваў Беларусі прагназуюць далейшы рост аб'ёмаў вытворчасці, попыту і прыбытку, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства эканомікі.**

«Кан'юнктурнае апытанне кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, праведзенае Навукова-даследчым эканамічным інстытутам Мінэканомікі ў чэрвені, зафіксавала перавагу пазітыўных настрояў топ-менеджараў. Больш за 80 працэнтаў апытаных распавяло аб павелічэнні (41 працэнт) або захаванні на ранейшым узроўні аб'ёмаў вытворчасці ў чэрвені. Кожны трэці адзначыў рост попыту на сваю прадукцыю. Таксама расце занятасць. Практычна 90 працэнтаў кіраўнікоў паведамілі аб захаванні або росце колькасці работнікаў», — расказалі ў Мінэканоміі.

Акцэнты

# САНКЦЫІ ЗАБЯСПЕЧЫЛІ МАГІЛЁЎСКІ ЗАВОД САМЫМ ВЫСОКІМ ПОПЫТАМ

**Перыяд санкцыйнага ціску забяспечыў Магілёўскі аўтамабільны завод імя С. М. Кірава (філіял ААТ «БелАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелАЗ-Холдынг») самым высокім попытам на іх прадукцыю за апошнія некалькі гадоў. Аб гэтым распавёў дырэктар філіяла Аляксандр МОНІЧ падчас рабочай сустрэчы з памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Магілёўскай вобласці Леанідам МАРТЫНЮКОМ, паведаміла БелТА.**

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці азнаёміўся з вытворчымі магутнасцямі завода. Ён адзначыў, што санкцыі, якія павінны былі негатыўна паўплываць на розныя галіны нашага жыцця, прынеслі больш карысці, чым шкоды. «Работа эканомікі і прадпрыемстваў у перыяд санкцыйнага ціску накладвае свой адбітак. Даводзіцца прыкладаць больш намаганняў, каб заставацца запатрабаванымі ў сваіх партнёраў, каб заваёўваць новыя рынкі збыту. І мы бачым на прыкладзе магілёўскага завода, што развіццё тут не спыняецца. Якасная тэхніка карыстаецца попытам, магутнасці загружаныя. Калі ёсць магчымасць выкарыстоўваць існуючыя ўмовы на карысць, гэта трэба рабіць. Прытым важна разумець, што асноўныя заходнія канкурэнты адсутнічаюць часова і гэты перыяд можа скончыцца. Час нельга ўпускаць, неабходна развівацца і падладжвацца пад бягучыя ўмовы, выкарыстоўваючы іх з максімальнай выгадай», — падкрэсліў Леанід Мартынюк.

Магілёўскі завод спецыялізуецца на вытворчасці і выпуску аўтамабільнай тэхнікі з 1958 года. Адзін з напрамкаў дзейнасці прадпрыемства — распрацоўка і ўкараненне ў дробнасерыйную вытворчасць тэхнікі для работ у шахтах. Эканамічныя паказчыкі за першае паўгоддзе дэманструюць рост. «Аб'ём вытворчасці склаў 132 працэнты. Аб'ём экспарту — 200 працэнтаў. Аб'ёмы растуць, завод у частцы вытворчасці машын загружаны поўнасцю, — адзначыў дырэктар філіяла. — Санкцыйны ціск, які ажыццяўляецца на Расійскую Федэрацыю, забяспечыў наша прадпрыемства самым высокім попытам за апошнія некалькі гадоў. Для нас гэта — акно магчымасцяў. Але разам з тым мы разумеем, што такі перыяд не будзе доўжыцца пастаянна, таму выкарыстоўваем адкрытыя магчымасці максімальна».

У планах на прадпрыемстве — мадэрнізацыя ліцейнай і механазборачнай вытворчасці. Ужо завяршаецца праект па ўзвядзенні фарбавальнага комплексу. Гэта ў перспектыве дасць магчымасць нарасціць аб'ёмы вытворчасці.

Добрая навіна

# З дапамогай мабільнага дадатку дарога становіцца прасцейшай

## А продаж электронных білетаў узрос амаль на 20 %

**Пасажыры Беларускай чыгункі (БЧ) за першае паўгоддзе афармілі праз інтэрнэт больш за 3,86 мільёна электронных білетаў на цягнікі з нумараванымі месцамі і больш за 1,1 мільёна білетаў на цягнікі з ненумараванымі месцамі (гарадскіх ліній і рэгіянальных ліній эканамічнага класа).**

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры БЧ, папулярнасць лічбавых тэхналогій у пасажыраў пастаянна павялічваецца. Найбольш актыўны прырост назіраецца ў сегменце электронных білетаў на цягнікі з нумараванымі месцамі. Па выніках першага паўгоддзя 74,4 % білетаў на цягнікі міжнародных, міжрэгіянальных ліній і рэгіянальных ліній бізнес-класа набылі на сайце pass.rw.by і з дапамогай мабільнага дадатку «БЧ. Мой цягнік». Для параўнання, у мінулым годзе доля продажаў электронных білетаў на цягнікі з нумараванымі месцамі складала 57 %.

У апошні час Беларуская чыгунка кардынальным чынам удасканальвае беспаперовыя тэхналогіі і дыстанцыйныя сэрвісы, такім чынам імкнучыся зрабіць іх максімальна простымі, даступнымі і зручнымі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Фларысты, рэстаўратары, спецыялісты па інфармацыйнай бяспецы

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Што датычыцца правілаў прыёму, то ў сёлетнюю ўступную кампанію выпускнікі 9-х і 11-х класаў будуць залічвацца па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі. Раней, нагадаем, адзінаццацікласнікі здавалі ЦТ. Праўда, змены не закрануць творчыя спецыяльнасці, а таксама прафесіі, звязаныя з фізічнай культурай і спортам. У такіх выпадках (акрамя сярэдняга бала атэстата) абітурыенты па-ранейшаму будуць здаваць і ўступныя іспыты. Гэта спецыфіка адбору таленавітых дзяцей.

План прыёму на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі складае 39,6 тысячы чалавек, з іх 27,4 тысячы будуць навучацца за кошт бюджэтных сродкаў. На 12,5 працэнта быў павялічаны прыём на аснове агульнай базавай адукацыі.

Пералік спецыяльнасцяў у каледжах пераглядаецца штогод. Набор па нейкіх закрываюць ці, наадварот, адначляюць. Гэта звязана з бягучай патрэбай базавых прадпрыемстваў у рэгіёнах у канкрэтных кадрах. У цэлым па краіне 24 установы адукацыі, што рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, пашырылі пералік спецыяльнасцяў, па якіх будуць ажыццяўляць падрыхтоўку.

Адкрываюцца таксама і новыя спецыяльнасці. Так, у філіяле БДУІР «Мінскі радыётэхнічны каледж» упершыню ў краіне на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі адкрыецца спецыяльнасць «Тэхнічнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі» з атрыманнем кваліфікацыі «Тэхнік па інфармацыйнай бяспецы».

Спецыяліст па інфармацыйнай бяспецы — адна з ключавых прафесій, запатрабаваных на рынку працы, бо амаль кожная арганізацыя сёння сутыкаецца з праблемай інфармацыйных пагроз і, як вынік, задачай гарантавання бяспекі даных. Пастаянна ўдасканальваюцца тэхналогіі абароны баз даных, але ўразлівасць абароны не толькі не змяншаецца, а ўвесь час расце. Выпускнікі дадзенай спецыяльнасці будуць маніторыць сістэмы інфармацыйнай бяспекі, устанаўліваць неабходныя тэхнічныя і праграмныя сродкі абароны, ажыццяўляць пошук магчымых каналаў уцечак даных, устаноўку, настройку і абслугоўванне тэхнічных і праграмна-апаратных сродкаў абароны інфармацыі. Спектр прадпрыемстваў, якія выказалі зацікаўленасць у выпускніках гэтай спецыяльнасці, дастаткова шырокі — ад банкаў да кампаній-рэзідэнтаў ПВТ, бо сёння любая арганізацыя сутыкаецца з праблемай інфармацыйных пагроз, таму спецыяльнасць надзвычай запатрабаваная. Раней атрымаць яе можна было толькі на ўзроўні вышэйшай адукацыі, але ўзнікла патрэба адкрыць падрыхтоўку і на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі.



Таксама ў Мінскім радыётэхнічным каледжы будзе праводзіцца набор на базе адзінаццаці класаў на дыстанцыйную форму навучання па спецыяльнасці «Распрацоўка і суправаджэнне праграмнага забеспячэння інфармацыйных сістэм» (тэрмін навучання складзе два гады дзесяць месяцаў). Нагадаем, што дыстанцыйная форма навучання была замацаваная ў новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі.

На фоне бурнага развіцця ў краіне мікраэлектронікі ААТ «Інтэграл» — кіруючая кампанія холдынга» выказала зацікаўленасць у заказе большай колькасці спецыялістаў для мікраэлектроннай прамысловасці, таму на спецыяльнасць «Вытворчасць вырабаў мікра- і нанаэлектронікі» ў бягучым годзе ў Мінскім радыётэхнічным каледжы будзе павялічаны набор — да 60 чалавек. Прычым на «Інтэграле» зацікаўленыя ў мэтавай падрыхтоўцы па згаданай спецыяльнасці, каб гарантавана атрымаць праз некалькі гадоў патрэбных спецыялістаў.

У Індустрыяльна-педагагічным каледжы РІПА таксама адкрываецца новая спецыяльнасць «Будаўніцтва і эксплуатацыя энергаэфектыўных будынкаў». Набор будзе весціся на аснове базавай адукацыі, а тэрмін навучання складзе тры гады дзесяць месяцаў.

У Мінскім дзяржаўным каледжы рамесніцтва і дызайну імя М. Кедышкі распачнецца падрыхтоўка фларыстаў. Набіраць на такі кірунак будуць як на ўзровень прафесійна-тэхнічнай, так і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. «Фларыстычны дызайн» — абсалютна новая прафесія ў нашай краіне. На гэту прафесію зараз вялікі попыт, паўсюдна патрабуюцца кампетэнтныя спецыялісты. Сёння надзвычай запатрабаванае дэкаратыўнае кветкавае афармленне розных памяшканняў, сацыяльных і культурных мерапрыемстваў, прэзентацый, вяселляў, фармальных і нефармальных сустрэч. Асноўныя заказчыкі кадраў — Мінскі парнікова-цяплічны камбінат, галоўнае гаспадарчае ўпраўленне Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і «Ружы.бел»

Спецыяліст чацвёртага разраду ўмее вырабляць круглыя, каскадныя, сіметрычныя букеты з жывых зрэзаных кветак і іншага расліннага матэрыялу ў спіральнай і паралельнай тэхніцы, кветкавыя кампазіцыі на фларыстычнай губцы. Фларыст пятага разраду будзе ствараць дэкаратыўныя структурныя букеты з жывых зрэзаных кветак, сухацвету, штучных кветак і іншага расліннага матэрыялу нестандартных формаў, з вялікай колькасцю зеляніны і дэкаратыўных элементаў са штучных і натуральных матэрыялаў, кветкавыя кампазіцыі нестандартных формаў, аксесуары.

Абітурыентам, якія паступаюць на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі, здаваць нічога не трэба. Да ўвагі бярэцца толькі сярэдні бал дакумента аб адукацыі. Калі малады чалавек першапачаткова жадае атрымаць больш высокую кваліфікацыю і мае намер падаваць дакументы на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі, то яму, акрамя прад'яўлення атэстата, трэба будзе вытрымаць яшчэ і творчы экзамен.

Таксама Мінскі дзяржаўны каледж рамесніцтва і дызайну імя М. Кедышкі ўпершыню будзе ажыццяўляць набор па спецыяльнасці «Абслуговая праца. Выяўленчая творчасць». Згаданы кірунак навучання прыцягальны для дзяўчат — будучых настаўніц працы і малявання ў пачатковых класах.

Спецыяльнасць «Рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы» з прысваеннем кваліфікацыі «Рэстаўратар дэкаратыўна-мастацкіх расфарбовак» адкрыецца ў Мінскім дзяржаўным каледжы тэхнікі і тэхналогій будаўніцтва, «Дызайн мультымедыя» — у Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя А. Глебава, «Выраб аптычных прыбораў» — у Мінскім дзяржаўным каледжы аўтамабілебудавання.

У рэгіёнах на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі таксама з'явяцца спецыяльнасці, новыя для канкрэтных каледжаў і актуальныя для рынку працы. Установы адукацыі разам з заказчыкамі кадраў імкнуцца ўлічваць запатрабаванні часу і запыты абітурыентаў, прапаноўваючы навінкі, якія адносяцца да самых розных сфер дзейнасці.

Напрыклад, у Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным каледжы будзе весціся набор па спецыяльнасцях «Распрацоўка і суправаджэнне вэб-рэсурсаў» з прысваеннем кваліфікацыі «Тэхнік-праграміст» і «Тэхнічнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі» (кваліфікацыя «Тэхнік па інфармацыйнай бяспецы»). У Віцебскім дзяржаўным індустрыяльна-тэхналагічным каледжы з'явіцца «Мадэляванне, канструяванне і тэхналогія швейных вырабаў», дзе стануць рыхтаваць мадэльераў-канструктараў. У Аршанскім дзяржаўным політэхнічным каледжы — «Будаўніцтва будынкаў і збудаванняў» (можна будзе стаць тэхнікам-будаўніком).

Абітурыенты, якія паступаюць пасля дзявятага класа ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на дзённую форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту, падаюць дакументы з 20 ліпеня да 3 жніўня, на платную дзённую форму — з 20 ліпеня да 14 жніўня. Абітурыентам дзённай формы атрымання адукацыі, што паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе трэба здаваць уступны іспыт, дакументы трэба падаць да 3 жніўня.

Выпускнікам 11-х класаў і ўстаноў прафтэхадукацыі, якія паступаюць на вочную (дзённую, вячэрнюю), дыстанцыйную або завочную форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту, неабходна прадставіць дакументы з 20 ліпеня да 12 жніўня, платнікам — з 20 ліпеня да 20 жніўня. Калі ж пры паступленні прадугледжаны ўступны экзамен, то і платнікі падаюць дакументы да 12 жніўня.

Уступныя іспыты ў ССНУ на дзённую форму атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту і на платнай аснове пройдуць з 4 да 8 жніўня, на вочную (дзённую, вячэрнюю), дыстанцыйную або завочную форму атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй або прафтэхадукацыі за кошт бюджэту і на платнай аснове — з 13 да 15 жніўня.

Залічаць абітурыентаў з агульнай базавай адукацыяй на дзённую форму атрымання адукацыі на бюджэт да 10 жніўня, платнікаў — да 16 жніўня. На аснове агульнай сярэдняй або прафтэхадукацыі залічэнне на дзённую бюджэтную форму навучання адбудзецца да 16 жніўня. На дзённай, дыстанцыйнай або завочнай форме атрымання адукацыі на платнай аснове на аснове агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі апошні дзень залічэння — 21 жніўня.

Аб дадатковым наборы на бюджэтныя месцы, што засталіся вакантнымі пасля залічэння, абітурыенты з агульнай базавай адукацыяй, якія паступаюць на дзённую форму атрымання адукацыі, павінны быць праінфармаваныя не пазней за 11 жніўня. Абітурыенты з агульнай сярэдняй або прафтэхадукацыяй даведаюцца аб вакантных месцах не пазней за 17 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Багдадзе сотні дэманстрантаў захапілі і падпалілі пасольства Швецыі

Сотні дэманстрантаў захапілі штурмам пасольства Швецыі ў Багдадзе, узлезлі на яго сцены і падпалілі ў знак пратэсту супраць чаканага спалення Карана ў Стакгольме. Аб гэтым паведаміла агенцтва Reuters. Адзначаецца, што ніхто з супрацоўнікаў дыпламатычнага прадстаўніцтва не пацярпеў. Міністэрства замежных спраў Швецыі пацвердзіла інфармацыю аб нападзе на пасольства, асудзіўшы яго і падкрэсліўшы, што ўлады Ірака павінны абараняць дыпламатычныя прадстаўніцтвы. Міністэрства замежных спраў Ірака выступіла з заявай, якая асуджае напад, паведаміла Associated Press. «Урад Ірака даручыў кампетэнтным органам бяспекі правесці тэрміновае расследаванне і прыняць неабходныя меры бяспекі, каб раскрыць абставіны інцыдэнту, вызначыць вінаватых у гэтым акце і прыцягнуць іх да адказнасці ў адпаведнасці з законам», — цытуе агенцтва заяву іракскага МЗС. Раней стала вядома, што шведскія ўлады дазволілі правесці акцыю спалення святой кнігі мусульман Карана і дзяржаўнага сцяга Ірака каля будынка блізкаўсходняй краіны ў Стакгольме.

### У Англіі праходзіць найбуйнейшая за дзесяцігоддзе забастоўка ўрачоў



Урачы ў Англіі праводзяць найбуйнейшую за дзесяцігоддзе забастоўку, якая пагражае яшчэ мацней ускладніць становішча ў Нацыянальнай службе аховы здароўя (NHS). Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на Брытанскую медыцынскую асацыяцыю (BMA). Асноўнае патрабаванне ўрачоў, інтарэсы якіх прадстаўляе BMA, зводзіцца да павелічэння акладаў на 35 працэнтаў. Як адзначаюць у прафсаюзе, такое павышэнне павінна кампенсаваць зніжэнне даходаў прадстаўнікоў прафесіі за апошнія 15 гадоў. Раней BMA адхіліла прапанову ўрада аб індэксацыі заробкаў на шэсць працэнтаў, назваўшы яе абразлівай. У Вялікабрытаніі за апошнія восем месяцаў у выніку шматлікіх забастовак медыцынскіх работнікаў было адменена амаль 700 тысяч урачэбных прыёмаў. На фоне забастовак медперсаналу чарга на атрыманне ўрачэбных паслуг узрасла да рэкорднага паказчыка. Згодна з распаўсюджанай статыстыкай, у чарзе знаходзіцца 7,47 мільёна чалавек. Гэта найвышэйшы паказчык з 2007 года, калі пачала весціся такая статыстыка.

### У ЗША ўдзельнік латарэі выйграў звыш мільярда долараў




Уладальнік каліфарнійскага білета латарэі Powerball выйграў джэкпот у памеры 1,08 мільярда долараў. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным сайце латарэі, паведаміла ТАСС. Імя шчаслівучыка пакуль не паведамляецца. Вядома толькі тое, што білет набылі ў Каліфорніі. Па ўмовах латарэі, пераможца можа разбіць увесь кошт прыза на 30 штогадовых выплат або атрымаць аднаразовую выплату ў памеры 516,8 мільёна долараў. Гэты прыз стаў трэцім па велічыні за час існавання латарэі Powerball. Рэкордны выйгрыш у мінулым годзе склаў 2,04 мільярда долараў.

# ДЭПАЗІТЫ НА РОЗНЫ ГУСТ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Эксперты рэкамендуюць не захоўваць усе яйкі (фінансы) у адным кошыку, таму калі вы — шчаслівы ўладальнік зберажэнняў, дыверсіфікуйце свае рызыкі і выбірайце розныя інструменты і розныя банкаўскія ўклады.

## ІНФЛЯЦЫЯ І СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ

Галоўны вораг грошай — інфляцыя. Менавіта яна абясцэньвае зберажэнні. І хоць візуальна здаецца, што даходы і зберажэнні растуць, на гэтую суму мы можам купіць усё менш тавараў. Калі ж нехта думае, што гэта не датычыцца замежнай валюты, то ён памыляецца. Напрыклад, долар ЗША за перыяд з 1990 года да 2020-га абясцэніўся ў два разы. Гэта значыць, што за 30 гадоў мы б страцілі роўна палову сваіх зберажэнняў у амерыканскай валюце, калі б яна ляжала пад падушкай без справы.

Разгледзім факты. Стаўка рэфінансавання з 28 чэрвеня знізілася да 9,5 % гадавых. А гэта значыць, што ў нас захоўваецца тэндэнцыя запаволення інфляцыйных працэсаў. У маі спажывецкія цэны знізіліся адносна красавіка бягучага года на 0,3 %. На такім фоне паказчык гадавой інфляцыі зменшыўся да 3,7 % з 4,7 % месяцам раней.

**Па доларавых дэпазітах стаўкі наогул знізіліся кардынальна. Максімальная стаўка па валютным укладзе на 13 месяцаў у аднаго камерцыйнага банка роўная 2 % гадавых.**

Як адзначылі ў прэс-службе Нацбанка, выходзячы з комплекснай ацэнкі сітуацыі ў эканоміцы, фактычнай і чаканай інфляцыі прымаецца рашэнне аб узроўні стаўкі рэфінансавання і тым самым аказваецца ўздзеянне на ўзровень будучай інфляцыі. Кіруючы стаўкай рэфінансавання, галоўны банк краіны ўплывае ў канчатковым выніку на стаўкі па крэдытах і ўкладах для кліентаў банкаў — фізічных і юрыдычных асоб.

## НА РОЗНЫЯ ТЭРМІНЫ

Цяпер самыя вялікія стаўкі прадугледжаны па безадзыўных укладах, якія маюць на ўвазе максімальныя тэрміны захоўвання грошай (не менш за два гады). Гэта ўклады з фіксаванай стаўкай даходнасці, якая роўная 12—12,5 % гадавых, таксама ёсць магчымасць папаўнення ўкладаў і штомесячная выплата працэнтаў.

Ёсць у самага буйнога камерцыйнага банка краіны безадзыўны ўклад «Паспяховы». Ён прадугледжвае захаванне грошай у банку на тых жа 13 месяцаў пад 12 % гадавых. Вось толькі мінімальная сума ўкладу пачынаецца ад 10 тысяч рублёў, тут ужываецца не фіксаваная, а пераменная стаўка.

Калі разглядаць больш кароткія тэрміны дэпазітаў, то найбольш выгадным выглядае ўклад на 190 дзён пад 7—9,5 %. Але ў дадзенай прапанове адсутнічаюць капіталізацыя, папаўненне дадатковых укладаў, датэрміновае або частковае зняцце і выплата працэнтаў. Безадзыўны ўклад на 170 дзён дае ўладальніку грошай ужо на 8 % гадавых. Тут таксама не прадугледжаны «плюшкі», а значыць паклаў грошы ў банк — на паўгода цалкам забыўся пра іх.

Самыя папулярныя цяпер уклады ў беларускіх рублях, якія выбіраюць нашы суайчыннікі, прапануюцца на адносна кароткія тэрміны. Гэта безадзыўныя дэпазіты на 45 і 95 дзён. Яны маюць даходнасць ад 3,5 % і 7,5 % адпаведна. Раней мы разгледзелі безадзыўныя ўклады, адзыўныя ж дэпазіты маюць меншую прыбытковасць — на 3—5 %.



Па доларавых дэпазітах стаўкі наогул знізіліся кардынальна. Максімальная стаўка па валютным укладзе на 13 месяцаў у аднаго камерцыйнага банка роўная 2 % гадавых. Яшчэ ў маі ўсе сістэмныя банкі па валюце давалі не менш чым 2,5 % гадавых. Цяпер за долары даюць не больш як 0,5—1,5 %. А, напрыклад, Беларусбанк прапануе свой самы выгадны валютны ўклад пад 0,4 % гадавых.

## РЫЗЫКІ ЁСЦЬ

Вядома, у банкаўскіх дэпазітаў ёсць і пэўныя недахопы. Многія ўклады аўтаматычна не прадаўжаюцца, таму вам неабходна самастойна адсочваць тэрмін заканчэння. Да таго ж не ўсе банкі прапануюць капіталізацыю працэнтаў, а гэта істотна ўплывае на канчатковы вынік. Таксама ў апошні час банкі часта прапануюць безадзыўныя дэпазіты, дзе ўкладчык губляе большую частку сваіх працэнтаў, калі яму трэба адклікаць уклад да яго завяршэння. Такія ўклады пазбаўляюць вас высокай ліквіднасці.

Да дадатковай рызыкі можна аднесці верагоднасць банкруцтва банка, а таксама павышэнне працэнтных ставак па новых дэпазітах. У апошнім выпадку вы проста не атрымліваеце сапраўды вялікі даход.

Эксперты сыходзяцца на думцы, што інфляцыя і далей будзе «даганяць» працэнты па банкаўскіх дэпазітах у доларах, а магчыма, і ў рублях. Гэта не азначае, што банкаўскія ўклады хутка знікнуць, але ўсё больш людзей будзе выбіраць больш прыбытковыя інвестыцыі (акцыі, карпаратыўныя аблігацыі). У цэлым, мэтазгодна захоўваць пэўную суму ў банку на «чорны дзень» або на дарагую пакупку, калі вы яе плануеце на працягу года. Але ў такім выпадку лепш выбіраць адзыўныя ўклады з капіталізацыяй працэнтаў. Для засцярогі ад інфляцыі трэба разбірацца з акцыямі, што не так ужо і складана. Але зусім простага спосабу, на жаль, няма.

## КАРПАРАТЫЎНЫЯ АБЛІГАЦЫІ

Мабыць, самым надзейным фінансавым інструментам на фондавым рынку з'яўляюцца аблігацыі. Гэта даўгавыя паперы, якія

**Нацбанк, не ўмешваючыся ў дагаворныя адносіны банкаў і іх кліентаў, з'яўляецца рэгулятарам грашова-крэдытнага рынку і выкарыстоўвае розныя метады, каб забяспечыць захаванасць рублёвых зберажэнняў ад інфляцыі.**

можа выпусціць як дзяржава, так і прыватная кампанія. Сэнс у тым, што эмітэнт пазычыў пэўную суму грошай у крэдытора, а праз названы ў аблігацыі прамежак часу павінен вярнуць намінальны кошт пазыковай паперы і купонны даход. Гэта як даць грошы ў доўг пад распіску і за невялікае ўзнагароджанне. Даход ад аблігацыі лічыцца такім чынам: складваюцца намінальная цана пазыковай паперы і купонны даход за час яе трымання.

У рэальнасці няма дакладнага адказу, якія аблігацыі больш выгадныя. Гэта кансерватыўны від інвестыцый — яны ўсё роўна маюць мінімальныя рызыкі. Пры іх выкарыстанні сур'ёзнай пагрозай для інвестара з'яўляецца дэфолт эмітэнта, простымі словамі — калі даўжнік не можа заплаціць. У дадзеным выпадку аблігацыі альбо страчваюць усякую каштоўнасць, альбо падлягаюць рэструктурызацыі.

**Да дадатковай рызыкі можна аднесці верагоднасць банкруцтва банка, а таксама павышэнне працэнтных ставак па новых дэпазітах. У апошнім выпадку вы проста не атрымліваеце сапраўды вялікі даход.**

Добрым варыянтам для захавання сродкаў будуць карпаратыўныя аблігацыі. Гэта доўгатэрміновы інструмент для інвеставання, і ў іх эмітэнтамі могуць выступаць як прыватныя, так і дзяржаўныя кампаніі. Дзяржаўныя лічацца больш надзейнымі, бо калі раптам у краіне здарыцца дэфолт, інвестары атрымаюць грошы назад, чаго нельга сказаць аб прыватных. Цяпер існуе шмат кампаній, якія прапануюць завоблачныя працэнты, з-за чаго павялічваецца рызыка для інвестара — верагоднасць, што яму вернуцца грошы, вельмі невялікая. Тут падчас набыцця аблігацый варта звяртаць увагу на крэдытны рэйтынг кампаніі або краіны.

Як правіла, карпаратыўныя аблігацыі прывязаныя да долара і маюць невялікую прыбытковасць. Але бываюць выключэнні. Літаральна ў гэтым месяцы з'явіліся аблігацыі адной саліднӑй кампаніі, дзе грашовым міналам выступае беларускі рубель. Дадзеная аблігацыя абяцае 22 % гадавых, а з 1 жніўня даходнасць яе павялічваецца да 25 % гадавых на працягу яшчэ двух гадоў. На думку спецыялістаў, такія аблігацыі найбольш прыбытковыя менавіта цяпер.

## ПАДАТКІ ВЫЛІЧАЦЬ АЎТАМАТЫЧНА

Падаткаабкладанне даходаў па ўкладах ажыццяўляецца падатковымі агентамі, яны ўпаўнаважаныя разлічваць і ўтрымліваць сумы падаходнага падатку з даходаў па ўкладах фізічных асоб на карысць бюджэту. Падаходны падатак утрымліваецца толькі з працэнтнага даходу (налічанага па стаўцы, якая перавышае стаўку да запатрабавання) па наступных укладах: у беларускіх рублях — на тэрмін менш за адзін год; у замежнай валюце — на тэрмін менш за два гады.

Для мэт падаткаабкладання пад пачаткам тэрміну ўкладу маецца на ўвазе дата ўнясення кожнай грашовай сумы на рахунак (першапачатковага ўзносу, дадатковага ўзносу), пад заканчэннем тэрміну — дата зняцця грашовай сумы. Падаходны падатак таксама ўтрымліваецца з працэнтнага даходу, налічанага на суму дадатковага ўзносу па ўкладах, якія не падпадаюць пад падаткаабкладанне, пры фактычным размяшчэнні гэтага дадатковага ўзносу на тэрмін менш за год у беларускіх рублях і менш за два гады ў замежнай валюце.

Напрыклад, дагаворам банкаўскага ўкладу прадугледжана магчымасць папаўнення ўкладу. Па ўкладзе ў беларускіх рублях тэрмінам на адзін год праз два месяцы пасля яго адкрыцця здзейснены дадатковы ўзнос. З працэнтнага даходу, налічанага на суму такога дадатковага ўзносу, будзе ўтрымлівацца падаходны падатак. Пры гэтым ён не ўтрымліваецца з працэнтаў, налічаных на капіталізаваныя працэнты.

## ЧЫТАЙЦЕ ДАГАВОР

Фінансавы рэгулятар адзначае, што банкі самастойна вызначаюць умовы заключэння здзелак з кліентамі і ўстанаўліваюць узровень працэнтных ставак па банкаўскіх укладах выходзячы з узроўню стаўкі рэфінансавання, стану грашовага рынку, уласнай дэпазітнай палітыкі і неабходнасці забеспячэння даступнасці крэдытаў. Па асобных відах банкаўскіх дэпазітаў памер ставак вызначаецца тэрмінам укладу, сумай, частатой выплаты даходу, аб'ёмам і характарам паслуг, нарэшце, залежыць ад выканання кліентам умоў дагавора.

Нацбанк, не ўмешваючыся ў дагаворныя адносіны банкаў і іх кліентаў, з'яўляецца рэгулятарам грашова-крэдытнага рынку і выкарыстоўвае розныя метады, каб забяспечыць захаванасць рублёвых зберажэнняў ад інфляцыі.

Памер працэнтаў па ўкладзе (дэпазіце) можа вызначацца: у абсалютным лікавым выражэнні (фіксаваная гадавая працэнтная стаўка); выходзячы з разліковай велічыні, прывязанай да базавага паказчыка, у парадку, узгодненым бакамі пры заключэнні дагавора банкаўскага ўкладу (пераменная гадавая працэнтная стаўка). Укладаатрымальнік не мае права ў аднабаковым парадку паменшыць памер працэнтаў па ўкладзе.

Перад падпісаннем дагавора банкаўскага ўкладу варта ўважліва вывучыць яго ўмовы, у тым ліку звяртаючы асаблівую ўвагу на наступныя моманты: працэнтная стаўка па ўкладзе з'яўляецца фіксаванай ці зменнай, а таксама на памер працэнтнай стаўкі, у тым ліку пры датэрміновым зняцці ўкладу (ці будуць пералічаныя працэнты па паніжанай працэнтнай стаўцы, калі кліент вырашыць скасаваць дзеючы дагавор). У выпадку ўзнікнення цяжкасцяў з разуменнем умоў дагавора ўкладу лепш звярнуцца да кансультанта банка па тлумачэнні і дапамогу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СЮЖЭТЫ ПА-ЗА ЧАСАМ

**На выхадных у эфіры тэлеканала «НТБ-Беларусь» гледачы змогуць пабачыць два фільмы вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм». Яны былі знятыя ў розны час і рознымі рэжысёрамі, але кожны варты прагляду за свае сюжэт, глыбіню і актуальнасць па-за часам.**



У суботу, 22 ліпеня, днём пакажуць драму **«Нядзельная ноч»**. Зняў яе ў 1977 годзе рэжысёр Віктар Тураў. Паводле сюжэта, у вёсцы адбылася трагедыя. П'яны трактарыст Сцяпан у запале рэўнасці накіраваў трактар на дом Алены, а яе жаніх Міхась перагарадзіў таму дарогу сваім трактарам. Зачыніўшы сітуацыі гіне, жанчына атрымлівае цяжкае раненне, і пракурор вырашае пераtварыць справу ў паказальны працэс. Аднак выязны суд апраўдаў падсуднага... Лёсы герояў кінастужкі на экране ўвасобілі Пётр Вельямінаў, Усевалад Платаў, Людміла Зайцава, Алена Вадалазава і шэраг іншых. Дарэчы, «Нядзельная ноч» была адзначана ўзнагародамі: на Усесаюзным кінафестывалі завяявала спецыяльны дыплом журы за найлепшую рэжысуру, а таксама не засталася незаўважанай работа актрысы Людмілы Зайцавай, якая атрымала прыз за найлепшую жаночую ролю.

А ўжо ў нядзелю, 23 ліпеня, можна паглядзець сацыяльную драму «Беларусьфільма» **«З юбілеем пачакаем»**, знятую рэжысёрам Барысам Гарошкам у 1985 годзе. Фільм знаёміць з асобамі, характарамі людзей, якія ў рабоце жывуць, можна сказаць, па законе «своя кашуля бліжэй да цела». Але аднойчы абставіны змяняюцца... Як пры гэтым мяняюцца дзеянні людзей, даведаецеся пасля прагляду. У кінастужцы зняліся акцёры Кірыл Лаўроў, Барыс Новікаў, Людміла Пісарава, Уладзімір Новік і іншыя. Што з таго выйшла, зможам убачыць у дзённым тэлеэфіры.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 196

**№ 106**



**№ 106** Рустам Шаяхметаў (Уфа)

**Белыя простыя:** a1, e1, d2, g3, f4, h4, g5, d6, f6, h6, e7 (11)

**Чорныя простыя:** a3, c3, e3, b4, c5, b6, a7, b8, f8 (9)

Наступныя дзве дамачныя праблемы складзеныя Міхаілам Сцефановічам. Самабытны беларускі шашачны кампазітар любіў гэту тэму замыкання.

**№ 107**

**Белыя простыя:** c1, g3, b4, f4, a5, b6, f6, a7 (8)

**Чорныя простыя:** f2, d4, h4, d6, c7, e7, d8, **дамка:** e1 (8)

**№ 108**

**Белыя простыя:** c1, f2, h4, g5, f6, e7, g7 (7)

**Чорныя простыя:** h2, e3, b4, d4, f4, b6, d8, дамка: g1 (8)

**№ 109** В. Арцюхін (Мінск)

**Белыя простыя:** a1, e1, b4, f4, a5, d6, h6 (7)

**Чорныя простыя:** d2, h2, c3, d4, c7, b8 (6)

**№ 110** Ю. Мурадаў (Барысаў)

**Белыя простыя:** c1, d2, e3, h4, g5 (5)

**Чорныя простыя:** a3, c5, e5, h6, c7, e7, b8 (7)

Дамачныя праблемы ў шашкі-100 даслаў Ю. Голікаў (Цвер).

**№ 111**

**Белыя простыя:** 46, 37, 26, 22, 23, **дамкі:** 28, 5 (6)

**Чорныя простыя:** 41, 36, 32, 16, 12, 14, 7, 8, **дамка:** 19 (7)

**№ 112**

**Белыя простыя:** 46, 37, 33, 26, 29, 23, дамкі: 5, 28 (8)

**Чорныя простыя:** 41, 36, 32, 18, 12, 14, 7, 8, дамкі: 19, 15 (10)

**№ 113**

Белыя простыя: 46, 43, 45, 37, 38, **дамка:** 5 (6)

**Чорныя простыя:** 36, 40, 33, 34, 29, 21, 7, 8, 10, **дамка:** 14 (10)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Двухразовы чэмпіён свету па шашачнай кампазіцыі Анатоль Шабалін выпусціў кнігу «Мелодыя шашачнай задачы». На яе старонках прадстаўлена каля чатырохсот аўтарскіх задач па шашках-100, пачынаючы ад простых да суперскладаных. Цікавыя каментарыі, успаміны і фатаграфіі. Па пытаннях набыцця звяртацца да аўтара: +375 29 3055958.

**Праверце свае рашэнні:**

**Выпуск № 195 ад 07.07.23.**

№ 100 1...23-29 2. 16:27 29-34 3. 40:29 19-23 4. 29:18 13:44+

№ 101 1...12-18! 2. 37-31?

[ 2. 38-33? 14-20 3. 25:05 18-23 4. 28:19 04-10 5. 05:14 09:47+]

[ 2. 44-39? 26-31 3. 37:17 18-22 4. 27:18 13:35+]

2...26:37 3. 42:31 18-23! 4. 28:19 14:23 5. 31-26 10-14 6. 26:17 23-28 7. 32:23 14-20 8. 25:14 09:18 9. 44-39 07-12 10. 17-11 16:07+

№ 102 1. b2-c3 d4:b2 [ 1... e5:e1 2. c3:c7 e1:c3 3. g5-f6 c3:g7 4. h6:a3 ]

2. g5-f6 e5:g7 3. h6:c1 h8-g7 4. c1-b2 g7-h6 5. b2-c3 h6-g5 6. c3-d2 g5-h4 7. d2-e1 a5-b4 8. e1:a5 h4-g3 9. a5-b6 g3-h2 10. b6-g1+

№ 103 1. g3-f4 e5:e1 2. c3:c7 e1:a1 3. h4-g5 b8:d6 4. g5-f6 a1:g7 5. h6:a3 h8-g7 6. a3-b2 g7-h6 7. b2-c3 h6-g5 8. c3-d2 g5-h4 9. d2-e1 a5-b4 10. e1:a5 h4-g3 11. a5-b6 g3-h2 12. b6-g1+

№ 104 1. d2-e3 e5:e1 2. e3:e7 f8:d6 3. c1-d2 e1:c3 4. g5-f6 c3:g7 5. h6:a3+

№ 105 1. e5-f6 g7:g3 2. c7-b8 h6:f4 3. d6-c7 f8:d6 4. c7:e5 f4:d6 5. b8:c5 g3-h2 6. c5-g1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ШТО ПАЧЫТАЦЬ У ЛІПЕНЬСКІМ НУМАРЫ «АЛЕСІ»




## «БЫЦЬ СЯБРАМІ СВАІМ ДЗЕЦЯМ»

Не кантраляваць дзяцей па дробязях, а выбудоўваць такія адносіны, каб нашчадкі самі захацелі падзяліцца сваімі хваляваннямі і радасцямі, — правіла Кацярыны Старавойтавай, пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2022» у намінацыі «Мацярынская слава».

— Лічу, бацькі павінны быць сябрамі сваім дзецям, але пры гэтым не губляць аўтарытэт, — расказвае аб сваіх педагагічных прынцыпах Кацярына Старавойтава ў гутарцы з журналістам «Алесі».

Мацярынства з яго нястомнымі клопатамі не перашкаджае жанчыне дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Яна ўзначальвае Першамайскую раённую арганізацыю г. Мінска ГА «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» і не ўяўляе сябе без любімай работы, якую гарманічна спалучае з выхаваннем шасці дзяцей.

## ДРАМАТУРГІЯ ЛЁСУ НАТАЛЛІ РУДНЕВАЙ

Народнай артыстцы Беларусі, дацэнту кафедры спеваў БДАМ Наталлі Рудневай неаднойчы прапаноўвалі напісаць пра сябе кнігу. Успомніць сапраўды ёсць пра што. Ёй шанцавала на цікавыя сустрэчы і падзеі, у яе лёсе шмат нечаканых паваротаў. Як дзяўчына з Самары стала прымай на славутай беларускай сцэне? Як удавалася сумяшчаць кар'еру і мацярынства? Што радуе ў «жыцці пасля славы» і навошта, на яе думку, патрэбнае мастацтва? Пра ўсё



гэта чытайце на старонках «Алесі».

— Упэўненая: глядач дарує тэхнічныя хібы, калі артыст даносіць да яго стан героя, калі жыве на сцэне, пакутуе, кахае, а не проста спявае і цешыцца сваім голасам, — лічыць Наталля Руднева, на думку якой мастацтва — прытулак для ратавання душы, задавальнення патрэбы ў прыгожым, добрым, высокім, чыстым.

## «ТЭАТР — ГЭТА РАЗМОВА З ГЛЕДАЧОМ»



З ліпеньскага нумара часопіса чытач даведаецца, чаму мастацкі кіраўнік і галоўны рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Сяргей Кавальчык, прадаўжальнік вядомай творчай дынастыі, шматдзетны бацька, лічыць сям'ю месцам сілы, якіх прынцыпаў ён прытрымліваецца ў выхаванні дзяцей і ці перашкаджае сумесная работа шлюбу. І, вядома, герой дзеліцца сваімі думкамі аб прафесіі рэжысёра, аб ролі мастацтва наогул.

— Тэатр — гэта размова з гледачом, — разважае галоўны рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. — Няхай на некалькі гадзін, але чалавек пераключаецца са штодзённасці, асабістых праблем і клопатаў на гісторыі выдуманых персанажаў, хваляюцца за іх, плача і смяецца над вымыслам. Мастацтва пашырае пункт гледжання, усяляе аптымізм, дае надзею на лепшы вынік падзей. Сам я таксама стараюся захоўваць у сабе веру ў лепшае, заражаць аптымізмам і энергіяй тых, хто навокал.

## НА СВЕТЛЫМ БАКУ ЖЫЦЦЯ

На старонках часопіса чытайце пра таямніцу поспеху мастачкі Алесі Скарабагатай, чые карціны вылучае яркая творчая індывідуальнасць і непаўторны аўтарскі почырк. Яны рэгулярна ўдастойваюцца прызоў глядацкіх сімпатый на выстаўках і фестывалях маладых мастакоў Беларусі. Іх ахвотна набываюць айчынныя і замежныя калекцыянеры.

— Я не адразу знайшла свой стыль, — успамінае мастачка. — Прайшла праз захапленне творчасцю Эгана Шыле, Клода Манэ, Антоніса ван Дэйка. Мне падабаецца і рэалістычны жывапіс, і імпрэсіянізм, і абстрактнае мастацтва. І сёння працягваю эксперыментаваць, шукаць. Мяняцца — цалкам нармальна і нават неабходна. Таму сама не ведаю, якой буду заўтра.

У многіх краінах сумуюць па страце класічнай школы, і таму такія работы, як у Алесі Скарабагатай, выклікаюць шчырае захапленне. Сама яна ўпэўненая: для любога мастака класічная школа — фундамент, без якога няма шанцу адбыцца ў прафесіі. Як выкладчык Акадэміі мастацтваў Алеся імкнецца перадаць тое веданне студэнтам.

## НАВУКА ДАПАМАГАЦЬ, ДОГЛЯД ТВАРУ І БАЗАВЫ ГАРДЭРОБ

У ліпені ў «Алесі» вы зможаце прачытаць парады псіхолага дарослым дзецям і іх бацькам пра тое, як дапамагаць адно аднаму, не дазваляючы маніпуляваць сабой. Даведаецеся, як правільна даглядаць скуру твару, — аб гэтым распавядзе касметолаг. А дызайнер, магістр мастацтвазнаўства, старшы выкладчык кафедры дызайну моды БДУ Марына Машэда раскажа аб правілах стварэння базавага гардэробу летняга сезона.

**Алена ВАЛЕР'ЕВА.**

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.30** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40** Навіны надвор'я.
**11.00, 12.15 Серыял «Сельскі дэтэктыў» (12+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Чужая сястра» (12+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**19.20 Меладрама «Правы апошняй ночы» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00** «Вайна народная» (12+).
**22.25 Серыял «След» (16+).**
**0.15** Арэна.
**0.50** Дзень спорту.
**1.05 Меладрама «Калі мяне не стане» (16+).**

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
**10.00, 14.30, 22.50** Тэлебарометр.
**10.05** «Сакрэты». Дак. драма (16+).
**10.30** «Я з вёскі» (12+).
**11.05 Дэтэктыў «Камея з Ватыкана» (16+).**
**14.55, 0.20** «На тыдзень» (16+).
**15.40** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**16.10** Мультсерыял «Прастаквашына» (6+).
**16.30** « Ваўкі і авечкі: ход свіннёй» (6+).
**17.40 Дэтэктыў «Акваторыя» (16+).**
**19.15** «Сляпая» (16+).
**19.45** «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
**20.10** «Сям'я. Перазагрузка». Дак. драма (16+).
**20.45, 21.20 Медыцынскі серыял «Практыка» (12+).**
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**22.55 Меладрама «Муж на сто дзён» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.30** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 15.25, 20.30, 23.05** «Навіны культуры».
**8.15 «Гусарская балада». Маст. фільм.**
**9.50** «Нацыянальны хіт-парад».
**10.40, 16.00 «У квадрацыі 45». Маст. фільм (12+).**
**11.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**12.15** «Архітэктура Беларусі».
**13.10, 21.05 «Вышыня 89». Маст. фільм (12+).**
**15.00** «Наперад у мінулае».
**15.35** «Навука побач» (6+).
**17.10** «Маладзечна-2023».
**18.50 «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55** «Люблю і памятаю».
**0.00** Святочны канцэрт Сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі да 10-годдзя тэлеканала «Беларусь 3».

### Беларусь 5

**7.00** Сняданак чэмпіёна.
**7.30** Футбол. Чэмпіянат Расіі.
**9.30** Хачу стаць...
**10.00** Футбол. Кубак Беларусі. «Макслайн» (Віцебск) — « Іслач» (Мінскі р-н).
**12.00** Футбол. Чэмпіянат Расіі.
